**В. Ф. Красюк,** *дацэнт*
*кафедры філасофіі, кандыдат*
*філасофскіх навук, дацэнт*

# МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСПЕКТЫ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА «ПАЛІТАЛОГІЯ» НА ФАКУЛЬТЭЦЕ ЗАВОЧНАГА НАВУЧАННЯ

Вывучэнне паліталогіі з'яўляецца важнейшай часткай падрыхтоўкі спецыялістаў-гуманітарыяў. На факультэце завочнага навучання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў вучэбны працэс па названай дысцыпліне складаецца з лекцый, семінарскіх заняткаў, кансультацый і экзаменаў. Студэнт-завочнік – гэта асоба, якая ўжо мае адносны вопыт сацыяльных стасункаў, пэўнае дачыненне да палітычных практык. Вывучэнне курса «Паліталогія» дапаўняе яе інтэлектуальны патэнцыял тэарэтычнымі палажэннямі, ведамі аб палітыка-дзяржаўных працэсах, інстытутах, з'явах, адносінах.

У метадалагічных адносінах вывучэнне паліталогіі мае пэўныя праблемы. Для студэнта-завочніка, які жыве працоўным жыццём і сваімі штодзённымі клопатамі, вядомую цяжкасць выклікае затэарэтызаванасць курса, вядомы адрыў ад рэальнага палітычнага працэсу. Тым больш значная частка студэнтаў схільна да апалітычнасці. Справа ўскладняецца адсутнасцю ўсведамлення неабходнасці палітычнай адукацыі, не гаворачы ўжо пра самаадукацыю. Паколькі колькасць гадзін для выкладання курса абмежаваная, то дэманстрацыя прыкладнога значэння палітычных ведаў у вывучэнні тэорыі даволі складаная. Напрыклад, для актывізацыі пошукавых інтэнцый студэнтаў у напрамку разумення сацыяльна-палітычных праблем краіны, асабістага ўдзелу ў іх вырашэнні нядрэнна было б перамяжаць паліталагічны практыкум з выкарыстаннем тэстаў. Аднак абмежаванасць гадзін адводзіць час толькі на правядзенне некалькіх семінараў, на якіх цяжка выявіць аб'ектыўную ўключанасць навучэнцаў у палітыку, іх месца ў ёй і палітычныя арыентацыі. Адсутнасць пастаяннага кантакту з завочнікамі, фрагментарнасць дыдактычных методык робяць праблемным ператварэнне навучэнцаў з пасіўнага аб'екта ў актыўнага суб'екта вучэбна-выхаваўчага працэсу. Нягледзячы на агульнасць галоўных вучэбных мэт і задач адносна цяжка гаварыць пра рэалізацыю сутворчасці двух партнёраў – выкладчыка і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнта. Так, са студэнтамі, якія ўпершыню знаёмяцца з тэарэтычнымі палажэннямі палітычнай навукі, ці наўрад апраўданым будзе правядзенне такіх інтэрактыўных метадаў работы, як «манаграфічныя семінары», дзелавыя гульні, дыспуты і г.д. Аднак можна рэкамендаваць на лекцыях, а на семінарах прымяняць, матэрыялы хрэстаматый па паліталогіі і іншыя першакрыніцы, што садзейнічае прывіццю будучаму спецыялісту навыкаў працы з арыгінальнымі тэорыямі, дзяржаўнымі і нарматыўна-прававымі дакументамі. Гэта будзе кірунак на павышэнне палітыка-прававой культуры.

Мае свае адметнасці і выбар форм прамежкавага і выніковага кантролю ведаў. Калі экзамен з'яўляецца канчатковым этапам вывучэння курса «Паліталогія», то зрабіць некаторыя вывады аб наяўнасці ў студэнтаў палітычных ведаў можна праз кантакт з імі ў працэсе семінарскіх заняткаў, калі ў межах адведзеных гадзін можна праверыць якасць выканання дадзеных папярэдне заданняў. Паколькі па гэтай дысцыпліне не прадугледжаны кантрольныя работы, то даць падобнае заданне на міжсесійны перыяд няма магчымасці; можна даць толькі тэматыку семінараў і пытанні. Важным момантам для арыентацыі студэнтаў завочнай формы навучання на авалоданне неабходнымі ведамі і для падрыхтоўкі да здачы экзамену з'яўляецца рэкамендаванне выкладчыкам мінімальнага – абавязковага і дадатковага – спісу вучэбнай і манаграфічнай літаратуры, тым больш з магчымым улікам спецыфікі факультэтаў. Гэта ў значнай меры паспрыяе вырашэнню агульнай задачы – трансляцыі палітычных ведаў, карэкцыі адпаведных установак, веданню форм сацыяльных паводзін, норм і каштоўнасцей палітычнай культуры.

Улічваючы мазаічны стан сучаснай палітычнай культуры нашага грамадства, трэба зазначыць, што ва ўмовах пашырэння дэмакратычных інстытутаў, уздзеяння розных каналаў інфармацыі індывіды ўжо не выступаюць у якасці аднамерных рэцыпіентаў, якія аўтаматычна ўспрымаюць палітычную інфармацыю па раней зададзенай схеме. Сённяшнія студэнты, у тым ліку і завочнікі, нягледзячы на сваю інтэлектуальна-духоўную дыферэнцыраванасць, выступаюць як дастаткова самастойныя сацыяльныя адзінкі са сваімі ўласнымі, хаця і недакладнымі, палітычнымі патрэбнасцямі і інтарэсамі. Гэта абумоўлівае неабходнасць прымянення такога метадалагічнага прыёму, як індывідуальны падыход да кожнага студэнта з улікам яго асабістых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

магчымасцей да авалодання ведамі і папярэдняй падрыхтаванасці. Таму выкладанне курса паліталогіі трэба праводзіць з увагай на тое, што, нягледзячы на ўзроставыя адрозненні студэнтаў-завочнікаў, у цэлым іх палітычная ідэнтычнасць яшчэ толькі фарміруецца; тым больш гэта адбываецца ва ўмовах біфуркацыйнага стану сацыяльнай сістэмы.

Паколькі палітычная рэальнасць датычыць кожнай асобы, то і студэнты ў аспекце свайго сацыяльнага становішча зацікаўлены ў разуменні сацыяльна-палітычных працэсаў. Таму ў выкладанні курса паліталогіі прысутнічае яшчэ адзін кампанент – інтарэс. Гэта важны сегмент педагагічнай справы, і яго трэба прымяняць для фарміравання ўнутранай арыентаванасці навучэнцаў і іх памкненняў выкарыстоўваць вучэбныя магчымасці дзеля ўмення ажыццяўляць аналіз палітычнай рэчаіснасці. Гэта мабілізуе актыўнасць і прыўносіць элемент творчасці.

У метадалагічным аспекце асабліваe месца займае сувязь паліталогіі з іншымі навукамі, у першую чаргу гуманітарнымі. Студэнты-завочнікі паралельна ці «ўпрытык» вывучаюць філасофію, сацыялогію, культуралогію, правазнаўства і іншыя навукі. Разгляд светапоглядна-метадалагічных пытанняў дапаўняе спецыфіку палітычных ведаў. З другога боку, паколькі ў студэнтаў яшчэ няма сфарміраванай базы ведаў, то паток новай інфармацыі абазначае пэўную складанасць; у гэтай сітуацыі многае залежыць ад выкладчыка, які павінен ведаць сваю справу і валодаць метадычнымі прыёмамі працы.

Асаблівасці працы са студэнтамі-завочнікамі не даюць вялікай магчымасці для актывізацыі індывідуальнай работы, распрацоўкі індывідуальных заданняў, што вызначае абмежаванне ў мэтах, аб'ёмах, змесце і канкрэтных тэмах курса.

Ва ўніверсітэце склалася практыка выбару паліталагічных прыёмаў выкладання паліталогіі зыходзячы са спецыфікі навучальнай установы, пры гэтым улічваюцца акалічнасці спецыяльнасцей. Галоўны напрамак зместу выбіраемых тэм – гэта ўзаемадзеянне палітыкі і культуры. Такая тэматычная накіраванасць адпавядае інтарэсам студэнтаў. Тэма лекцыі і семінарскага занятку «Палітычная культура» ў гэтым плане апраўдана. Таксама і ў іншых тэмах неабходна ўлічваць іх змест у суаднесенасці з праблемамі культуры, культуратворчай дзейнасці ў нашым грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўны кантакт са студэнтамі ў перыяд выкладання курса адбываецца падчас правядзення семінарскіх заняткаў. Сучасныя тэхналогіі навучання даюць магчымасць нават ва ўмовах абмежаванага часу выкарыстоўваць наватарскія метады. Адзін з іх – эўрыстычны. Ён прыдатны для рэалізацыі ідэі актыўнага навучання і інтэграцыі самастойнай падрыхтоўкі студэнтаў, іх творчай работы на семінары. Сутнасць метаду – у арганізацыі працэсу плённага нестандартнага мыслення, у пастаноўцы і рашэнні задач, звязаных з мадэлямі прыняцця прымальных установак ва ўмовах праблемных сітуацый. Эўрыстычнае навучанне ёсць калектыўны метад рашэння цяжкіх праблем, заснаваны на тым, што члены акадэмічнай групы актыўна удзельнічаюць у абмеркаванні адказу свайго таварыша. Задаюць яму дадатковыя пытанні, патрабуюць аргументацыі ім свайго адказу і выказванняў, прыводзяць контраргументы. Эўрыстычны падыход абавязвае выкладчыка задаваць студэнтам серыю навадных пытанняў, прыкладаў, садзейнічае стварэнню праблемных і парадаксальных сітуацый, атмасферы пошуку і навацый. На папярэдняй лекцыі мэтазгодна даць некаторым студэнтам заданне падрыхтаваць для семінара даклады па вызначаных пытаннях.

І усё ж галоўны ўнёсак студэнта-завочніка ў арганізацыю вучэбнага працэсу выпадае на самастойную працу ў міжсесійны перыяд. У гэтым аспекце самастойная праца ўяўляе сабой мэтанакіраваную асэнсаваную самастойную работу. Пачынаецца яна з установачных арыенціраў, якія задае выкладчык: знаёміць са зместам і задачамі курса паліталогіі, яго актуальнасцю, рэжымам і храналогіяй вывучэння, асаблівасцямі тэматыкі, літаратурай, пастаноўкай пытанняў на экзамен і, што самае галоўнае, – дае заданні на міжсесійны перыяд. Іх змест – раскрыць неабходную тэматыку і асаблівасці курсу. Трэба таксама азнаёміць з пытаннямі на экзамен.

Сучасныя тэхналогіі навучання патрабуюць увядзення ў вучэбны самастойны працэс не толькі сукупнасці падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, але і электронных сродкаў навучання, інфармацыйна-камп’ютарных тэхналогій. Не сакрэт, што ў некаторых населеных пунктах сельскай мясцовасці закрываюцца клубы і бібліятэкі, а бібліёбусы не ў стане задаволіць узрастаючую патрэбу ў інфармацыі. Таму павышаецца роля выкарыстання магутнасцей тэлекамунікацыйных сетак. Сеткі Internet даюць магчымасці завочніку прымяняць новыя інфармацыйныя тэхналогіі: здольнасці web-браўзераў, электроннай пошты, web-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

старонкі і т.д. Наогул, мультымедыйныя сродкі пашыраюць магчымасці выбару і падбору вучэбнага матэрыялу; напрыклад, у электроннай бібліятэцы ўніверсітэта размешчаны праграма курса «Паліталогія», планы семінарскіх заняткаў і кантрольныя пытанні.

Формамі кантролю СРС можна лічыць правядзенне тэсціравання на семінарскім занятку, пісьменнай справаздачы аб выкананні міжсесійных заданняў па вывучэнні літаратуры і, зразумела, здачу экзамену.

З улікам змяненняў у арганізацыйна-праграмных установках вывучэння курса «Паліталогія» мяняюцца і падыходы да распрацоўкі комплексу метадычнага забеспячэння самастойнай работы студэнтаў завочнай формы навучання, а таксама ролі выкладчыка ў якасці кіраўніка вучэбнага працэсу. Асноўныя кірункі выкладання курса задаюцца тыпавой вучэбнай праграмай для ВНУ, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ